***Арунас Бубныс (Вільня),***
*доктар гісторыі,*
*Інстытут гісторыі АН Літвы*

# Баланс удзелу літоўцаў у Другой сусветнай вайне

Неспатыканае дагэтуль зацікаўленне і дыскусіі выклікала ў літоўскім грамадстве 60-годдзе заканчэння Другой сусветнай вайны. Многія гісторыкі, палітолагі і палітыкі стараюцца адказаць на пытанне: якое значэнне Другая сусветная вайна мела для Літвы, і якімі былі яе вынікі для Літвы? Грамадскую дыскусію завастрыла справа святкавання Перамогі ў Маскве. Прэзідэнт Літвы Валдас Адамкус разам з кіраўнікамі іншых краінаў быў запрошаны ў Маскву, каб святкаваць перамогу антыгітлераўскай кааліцыі. Некалькі месяцаў у Літве адбывалася дыскусія, ці прэзідэнт павінен ехаць у Маскву? Выказваўся аргумент, што Савецкі Саюз, спадкаемцам якога сёння з'яўляецца Расея, выкарыстаў вайну для рэалізацыі сваіх імперскіх інтарэсаў. Ахвярай яго амбіцый стала Літва і іншыя балтыйскія дзяржавы. Ад савецкай экспансіі пацярпела большасць краінаў Сярэдняй і Усходняй Еўропы. Гэтая экспансія не можа быць апраўданай нават у кантэксце барацьбы з нацызмам. Акупацыя і анексія балтыйскіх краінаў была парушэннем элементарных нормаў міжнароднага права. Сучасная Расея не прызнае адказнасці за тыя дзеянні і аспрэчвае факт анексіі. Таму сёння Масква не тое месца, дзе прэзідэнт Літвы павінен святкаваць перамогу над фашызмам. Знішчэнне аднаго зла (фашызму) не апраўдвае прыняцця другога зла (савецкага камунізму)[1]. Прэзідэнт Адамкус, паслухаўшы розныя аргументы, вырашыў не ехаць у Маскву. Таксама паступіў прэзідэнт Эстоніі Арнольд Руутэль.

Сойм Літвы прыняў спецыяльную заяву пра Другую сусветную вайну. У ёй адзначана, што Літва цэніць гістарычнае значэнне перамогі над фашызмам, але гэтая перамога прынесла для Літвы паўторную савецкую акупацыю, якая працягвалася некалькі дзесяцігоддзяў і прынесла вялікія страты. Прайшоў час, калі ўсе еўрапейскія краіны, у тым ліку Расея, выказвалі пашану не толькі ахвярам нацызму, але і бальшавізму.

[1] Асвядчэнне гісторыкаў Літвы.

Прабачэнне, талеранцыя, згода і аб'ектыўная ацэнка вынікаў Другой сусветнай вайны – найлепшы доказ таго, што вайна нечаму навучыла[2].

Хоць Літва як дзяржава не ўдзельнічала ў Другой сусветнай вайне, аднак таксама стала яе ахвярай. Яна страціла незалежнасць, пацярпела ад акупацыйных таталітарных рэжымаў, панесла вялікія людскія страты і перажыла тэрытарыяльныя змены. Жыхары былі мабілізаваныя ў розныя вайсковыя і паліцыйныя фармаванні Савецкага Саюзу і Германіі. У савецкую армію ў 1944 – 1945 г. было мабілізавана каля 100 тыс. жыхароў Літвы розных нацыянальнасцяў, а ў вайсковыя і паліцыйныя часткі Германіі – каля 40 тыс. асобаў. Тысячы людзей загінулі падчас ваенных дзеянняў і на заплеччы франтоў за чужыя для літоўцаў інтарэсы таталітарных дзяржаваў.

Заканчэнне Другой сусветнай вайны народы Еўропы прынялі з рознымі пачуццямі і настроямі. Для Заходняй Еўропы гэта азначала пачатак новай эры. Краіны Заходняй Еўропы перамаглі ў вайне, вярнулі незалежнасць і дэмакратычны лад жыцця, атрымалі магчымасць адбудовы гаспадаркі. Затое Сярэдняя і Усходняя Еўропа аказалася падпарадкаванай іншаму таталітарызму – савецкаму. У краінах гэтага рэгіёну з дапамогай Саветаў на доўгія дзесяцігоддзі ўсталяваліся антыдэмакратычныя камуністычныя рэжымы. Балтыйскія краіны зноў прымусова былі далучаныя да СССР. Літва, Латвія і Эстонія сталі адзінымі краінамі ў Еўропе, якія не атрымалі хоць бы фармальнай дзяржаўнасці. Савецкі рэжым прынёс Літве новыя масавыя рэпрэсіі, саветызацыю грамадскага жыцця і эканомікі, асіміляцыю і русіфікацыю. 1945 г. азначаў для Літвы не вызваленне і мір, а няволю, прыгнёт і "вайну пасля вайны". Да смерці Сталіна ў Літве адбывалася партызанскае змаганне супраць савецкага рэжыму і масавыя рэпрэсіі савецкіх службаў бяспекі супраць жыхароў Літвы.

Першыя тэрытарыяльныя і чалавечыя страты Літва панесла яшчэ перад Другой сусветнай вайной. Ужо ўвосень 1938 г. значная частка нямецкага насельніцтва Клайпедскай акругі, маючы падтрымку гітлераўскай Германіі, пачала актыўна патрабаваць далучэння гэтага краю да III Рэйху. Ніводная з магутных еўрапейскіх дзяржаваў не захацела падтрымаць пакінутую Літву. 22 сакавіка 1939 г. Літва была вымушаная падпісаць і ратыфікаваць дамову, паводле якой Клайпедская акруга далучалася да Германіі[3]. Літва страціла адзіны свой марскі порт. Нацысты пачалі пераслед літоўскіх дзеячоў, якія засталіся ў акрузе. Ужо ў першы тыдзень пасля анексіі Клайпеды нямецкая паліцыя арыштавала

---

[2] Асвядчэнне Сойму Літоўскай Рэспублікі ад 26 красавіка 2005 г. // www.delfi.lt.

[3] Błaszczyk G. Litwa współczesna. Warszawa-Poznań, 1992. S. 102.

183 асобы, з якіх 123 былі пасаджаны ў вязніцу на працяглы тэрмін[4]. Некаторыя з арыштаваных літоўцаў пазней былі высланыя ў канцэнтрацыйныя лагеры на тэрыторыі Генеральнага губернатарства. Пасля анексіі Клайпеды колькасць насельніцтва дзяржавы зменшылася з 2575,4 тыс. да 2442,8 тыс. асобаў. Многія літоўцы і жыды перайшлі ў г. зв. Ковенскую Літву[5].

У сярэдзіне 1939 г. адбылося значнае пагаршэнне міжнароднай сітуацыі Літвы. Лёсы народаў Усходняй і Цэнтральнай Еўропы пачалі вырашаць дзве таталітарныя дзяржавы – Германія і Савецкі Саюз. Паводле дамоваў паміж імі Літва спачатку апынулася ў зоне нямецкіх (23 жніўня 1939 г.), а пазней – савецкіх уплываў (28 верасня 1939 г.). Адной з прычынаў перадачы Літвы Савецкаму Саюзу быў літоўскі нейтралітэт, адмова ад падтрымкі нямецкай арміі ў нападзе на Польшчу[6]. Прэзідэнт Літвы Антанас Сметона і літоўскі ўрад рашуча адхілілі намовы немцаў выкарыстаць вайну для заняцця Вільні. Толькі пасля паразы Польшчы і заняцця Саветамі ўсходніх польскіх земляў Літва рашылася на падпісанне з СССР дамовы адносна Вільні (10 кастрычніка 1939 г.). Дамова гарантавала Літве захаванне незалежнасці і атрыманне тэрыторыі памерам 6656 кв. км з Вільняй. СССР запэўніў сабе дыслакацыю ў Літве чатырох гарнізонаў Чырвонай Арміі (20 тыс. жаўнераў). Літва атрымала сваю гістарычную сталіцу, але размяшчэнне на яе тэрыторыі чужых войскаў азначала пачатак страты незалежнасці і статусу нейтральнай дзяржавы.

Пасля ўваходу нямецкіх войскаў 14 чэрвеня 1940 г. у Парыж СССР, карыстаючыся сітуацыяй, калі ўвага дэмакратычных дзяржаў была скіраваная на Францыю, выставіў Літве ультыматум, у якім запатрабаваў стварыць новы, прыхільны да СССР урад, дапусціць у краіну дадатковыя войскі. Гэта азначала фактычную акупацыю краіны. Ноччу з 14 на 15 чэрвеня ўрад Літвы вырашыў прыняць ультыматум. Савецкі Саюз акупаваў Літву і тым самым парушыў усе існуючыя з ёй дамовы[7].

Летам 1940 г. ў Літве пачаўся камуністычны тэрор, метады і наступствы якога літоўскія гісторыкі часта называюць людабойствам. Хоць савецкая прапаганда называла гэты тэрор “класавай барацьбой” або неабходнасцю “знішчэння буржуазіі як класу”, у сапраўднасці ад каму-

4 Grybkauskas S. Lietuvių vyriausybės reakcija į nacistinės Vokietijos politiką Klaipėdos krašto lietuvių atžvilgiu (1939.03.23-1940.06.15) // Genocidas ir rezistencija. 1998. Nr. 1(3). P. 77.

5 Eberhardt P. Przemiany narodowościowe na Litwie. Warszawa, 1997. S. 148.

6 Jakubčionis A. Odzyskanie Wileńszczyzny i utrata niepodległości Litwy // Opór wobec systemów totalitarnych na Wileńszczyźnie w okresie II wojny światowej. Gdańsk, 2003. S. 18.

7 Тамсама. S. 19.

ністычнага тэрору пацярпелі ўсе грамадскія слаі і ўсе народы Літвы. Ужо ў першыя дні савецкай акупацыі былі арыштаваныя і вывезеныя ўглыб СССР былы прэм'ер Антанас Меркыс, міністр замежных справаў Юзас Урбшыс і многія з вышэйшых кіраўнікоў краіны. Яшчэ перад фармальным уключэннем Літвы ў склад Савецкага Саюзу 11 і 12 ліпеня 1940 г. арыштавана каля 2 тыс. вядучых літоўскіх дзеячоў.

3 жніўня 1940 г. Літва была фармальна ўключана ў склад СССР як савецкая рэспубліка. Літоўская дзяржава пасля 20 гадоў існавання страціла незалежнасць. З боку ЗША і Вялікабрытаніі ніякай рэакцыі на агрэсію СССР і парушэнне ўсіх міжнародных дамоўленасцяў не было, хоць фармальна гэтыя краіны не прызналі інкарпарацыю Літвы[8]. З канца 1940 г. НКУС распачаў падрыхтоўку да масавай дэпартацыі жыхароў Літвы ў Сібір. Савецкія службы бяспекі атрымалі даручэнне сачыць, рэгістраваць і заводзіць справы на кіраўнікоў і актыўных дзеячоў былых палітычных партый, грамадскіх арганізацый, былых афіцэраў літоўскай арміі і дзяржаўных служачых[9]. У канцы траўня-пачатку чэрвеня 1941 г. было завершана складанне спісаў асобаў прызначаных на вываз. Масавыя дэпартацыі распачаліся 14 чэрвеня і працягваліся да пачатку нямецка-савецкай вайны. Гэта быў найбольш бязлітасны вываз: мужчынаў адлучалі ад сям'і і накіроўвалі ў лагеры. Большасць з іх загінула. У часы першай савецкай акупацыі ў Літве было арыштавана і дэпартавана 31 тыс. чалавек. Сярод арыштаваных каля 2 тыс. было забіта ў Літве[10]. Большасць дэпартаваных складалі літоўцы, сярод высланых былі таксама палякі (3924), жыды (2052), расейцы (258), беларусы (78), немцы (40)[11].

Значная частка вывезеных у Сібір памерла ад голаду і холаду. У пачатку вайны, калі Чырвоная армія адыходзіла, яе аддзелы і органы НКУС забілі ў Літве яшчэ каля 1100 цывільных асобаў і зняволеных[12]. Хуткае апанаванне Літвы нямецкай арміяй уратавала краіну ад чарговых дэпартацый і ахвяраў камуністычнага рэжыму. Частка літоўскага грамадства супрацоўнічала з камуністычным рэжымам, веручы, што Саветы захаваюць аўтаномны статус Літвы і будуць праводзіць сацыяльныя і эканамічныя рэформы. Але рэальнасць расчаравала пераважную большасць літоўскага народу. Бальшавіцкая ўлада сваім тэрорам выклікала негатыўную рэакцыю ва ўсіх слаях літоўскага грамадства. Большасць літоў-

8 Eberhardt P. Przemiany narodowościowe... S. 152.

9 Grunskis E. Lietuvos gyventojų trėmimai 1940-1941, 1945-1953 metais. Vilnius, 1996. P. 24.

10 Anusauskas A. Sovietinis genocidas ir jo padariniai // Lietuvos gyventojų genocidas. Antrasis pataisytas ir papildytas leidimas (1939-1941). Vilnius, 1999. P. 31.

11 Тамсама. P. 30.

12 Тамсама. P. 30.

цаў чакала ад нямецка-савецкай вайны вызвалення ад Саветаў. Савецкая акупацыя выклікала ўзнікненне руху супраціву, які падрыхтаваў народ да ўзброенай барацьбы і вяртання незалежнасці. 23 чэрвеня 1941 г. ковенскае радыё абвясціла аднаўленне незалежнасці і паведаміла пра стварэнне Часовага ўраду Літвы (Lietuvos laikinoji vyriausybл). Гэтая інфармацыя была сігналам да ўсенароднага антысавецкага паўстання з мэтай вольнасці краіны[13]. Літоўскія паўстанцы ў першыя дні вайны лічылі вермахт саюзным войскам. Нямецкія войскі часта віталіся жыхарамі Літвы. Калі немцы ўваходзілі ў Літву, эшалоны дэпартаваных знаходзіліся яшчэ ў дарозе ўглыб Расеі, а тыя, хто застаўся перажывалі страх перад няпэўнай будучыняй.

Аднак энтузіязм адносна немцаў і надзеі на адбудову дзяржавы хутка развеяліся. Першым дысанансам стала непрызнанне Часовага ўраду Літвы (які яшчэ функцыянаваў да 5 жніўня 1941 г.). 25 ліпеня 1941 г. была створана нямецкая цывільная адміністрацыя (Ziwilverwaltung) на чале з генеральным камісарам Адрыянам фон Рэнтэльнам. Акупаваная Літва атрымала назву "Генеральны Камісарыят Літвы" і стала часткай Рэйсхкамісарыяту Остланд. Адміністрацыйным цэнтрам Літвы было вызначана Коўна. Кіраўніцтва і адміністрацыя краіны знаходзіліся ў нямецкіх руках. Нацысцкая ўлада старалася падпарадкаваць увесь людскі і эканамічны патэнцыял краю мэтам нямецкай ваеннай машыны. Большасць літоўскіх органаў і інстытутаў, якія ўтварыліся ў пачатку вайны, і былі немцам патрэбныя для арганізацыі кіравання, захаваліся разам з іх літоўскімі кадрамі. Літоўская адміністрацыя была падпарадкаваная нямецкаму кіраўніцтву і мелася стаць выканаўчым інструментам нямецкай улады. На яе чале як сувязуючы орган з акупацыйнай уладай сталі прызначаныя акупантамі генеральныя дарадцы, пад камандай генерала Петраса Кубілюнаса. Магчымасці генеральных дарадцаў былі вельмі абмежаванымі, адзінай іх роляй было выкананне распараджэнняў акупантаў. З прапагандысцкіх меркаванняў немцы жадалі, каб непапулярныя распараджэнні былі выдаваныя генеральнымі дарадцамі, адцягваючы незадавальненне на гэтыя органы[14]. Гэтак званае літоўскае самакіраванне амаль нічым не адрознівалася ад уладкавання іншых захопленых краінаў, якія былі адназначна варожыя да немцаў, напр. Генеральнага губернатарства. Немцам папросту не хапала сілаў для ахопу ўсіх праблемаў кіравання. Шмат важных пасадаў у літоўскім самакіраванні занялі "вальдэмараўцы" – адгалінаванне былой кіруючай партыі таўцінін-

[13] Jegelevičius S. Okupacja i kolaboracja na Litwie w czasie II wojny światowej // Opór wobec systemów totalitarnych… S. 30.

[14] Powstanie narodowego ruchu litewskiego c. d. (Stosunki od r. 1942). Archiwum Akt Nowych w Warszawie (dalej AAN). Sygn. 202/III. S. 284.

каў. З грона гэтых літоўскіх нацыяналістаў і фашыстаў былі прызначаныя некаторыя генеральныя дарадцы і іншыя функцыянеры самакіравання. Гэтыя людзі былі гарачымі прыхільнікамі немцаў і многія з іх да канца акупацыі засталіся ў пранямецкім лагеры, звязаўшы свой лёс з лёсам III Рэйху. Яны актыўна падтрымлівалі немцаў ва ўвядзенні нямецкага парадку ў краіне, удзельнічалі ў рэпрэсіях супраць палітычных ворагаў нацызму, у пераследзе жыдоў, палякаў і іншых этнічных меншасцяў Літвы. Літоўскія паліцэйскія батальёны сталі прыладай акупантаў у правядзенні палітыкі экстэрмінацыі і масавых рэпрэсій.

Стратэгічнай мэтай уладаў III Рэйху было як найхутчэйшае пераўтварэнне балтыйскіх краінаў у нямецкую "жыццёвую прастору". У інструкцыі Альфрэда Розэнберга рэйхскамісару Остланду гаварылася: "Мэтай рэйхскамісара ў Літве, Эстоніі, Латвіі і Беларусі павінна быць імкненне да ўтварэння пратэктарату, а потым пераўтварэнне гэтага абшару ў частку Рэйху праз германізацыю расава блізкага элементу, нямецкую каланізацыю і выдаленне элементу непажаданага"[15]. Гэтыя стратэгічныя мэты меліся быць рэалізаваныя пасля перамогі немцаў у вайне.

Ужо ад самага пачатку нацысцкай акупацыі пачалася планавая і вельмі інтэнсіўная экстэрмінацыя жыдоўскага насельніцтва. Да нямецка-савецкай вайны ў Літве жыло каля 210 – 220 тыс. жыдоў. Некалькі тысячаў уцяклі разам з адступаючай савецкай арміяй. З уваходам немцаў пачаліся пераследы. Напачатку былі асобныя пагромы, арышты камуністаў і савецкіх дзеячоў жыдоўскага паходжання, пазбаўленне грамадзянскіх правоў, пагрозы і загад насіць жоўтыя зоркі Давіда. У другой палове ліпеня 1941 г. з'явіліся першыя гета. У сярэдзіне лета пачаліся масавыя расстрэлы жыдоўскіх сем'яў, найперш у вялікіх гарадах, а потым і ў малых мястэчках. Ужо ў жніўні ўзніклі гета ў Коўне і Шаўлях.

У Вільні гета з'явілася ў пачатку верасня 1941 г. Спачатку ў горадзе было два гета, у якіх сагналі каля 40 тыс. жыдоў. Масавыя забойствы жыдоў адбываліся і пасля ўтварэння гетаў – у Вільні і Панарах. Расстрэлы праводзіў спецыяльны аддзел (Sonderkommando), падпарадкаваны нямецкай паліцыі бяспекі СД. Да снежня 1941 г. у Вільні забіта каля 33 тыс. жыдоў. Масавыя і сістэматычныя забойствы жыдоў адбываліся па ўсёй Літве. Да снежня 1941 г. было вынішчана ўжо каля 80% усяго жыдоўскага насельніцтва краіны. Засталіся толькі чатыры гета: у Вільні, Коўне, Шаўлях і Свянцянах, у якіх жыло каля 45 тыс. чалавек. Хоць ініцыятарам і арганізатарам Галакаусту была нацысцкая ўлада, у масавых забойствах жыдоў разам з гестапа бралі ўдзел розныя фармаванні літоўскай паліцыі і былыя антысавецкія партызаны. У снежня 1941 г. у акцыях

[15] Eberhardt P. Przemiany narodowościowe... S. 154.

масавай экстэрмінацыі наступіў перапынак. Яго прычынай быў ціск з боку цывільнай адміністрацыі і вермахту, якім была патрэбная жыдоўская працоўная сіла. Ліквідацыя гетаў і працоўных лагераў у мястэчках Віленшчыны аднавілася вясной 1943 г. Віленскае гета немцы зліквідавалі ў канцы верасня 1943 г. Большасць яго жыхароў была высланая ў працоўныя лагеры ў Эстоніі і Латвіі, частку забілі ў Панарах[16]. Пад канец нацысцкай акупацыі (у ліпені 1944 г.) былі зліквідаваныя гета ў Коўне і Шаўлях. Жыдоў вывезлі ў канцэнтрацыйныя лагеры Дахау, Штутгоф, Аўшвіц і інш. Агулам за гады вайны былі знішчаныя каля 195 – 200 тыс. жыдоў Літвы. Вайну пеpажылі толькі 5% жыдоўскіх жыхароў краіны. Адначасова быў знішчаны шматвяковы культурны і эканамічны даробак жыдоўскай супольнасці.

У часы нацысцкай акупацыі тэрор ахапіў не толькі жыдоўскую, але і іншыя нацыянальныя і палітычныя супольнасці краіны. Акрамя жыдоў найбольш зацята пераследавалі камуністаў, функцыянераў камуністычнага рэжыму, ваеннапалонных, удзельнікаў супраціву, цыганоў. У першыя тыдні нацысцкай акупацыі былі рэпрэсаваныя камуністы розных нацыянальнасцяў, камсамольцы, дзеячы і прыхільнікі савецкай улады. Шмат тысячаў гэтых людзей арыштавалі, каля 5 тыс. з іх расстралялі (большасць складалі літоўцы).

У канцы 1941 г. у Літве паўстаў савецкі (камуністычны) рух супраціву, які кіраваўся з Масквы праз Камуністычную партыю Літвы. Яго мэтай было вяртанне савецкай улады. Камуністычнае падполле мела інтэрнацыянальны характар. З сярэдзіны 1943 г. развіваўся савецкі партызанскі рух, асабліва ва Усходняй Літве, які вёў актыўную барацьбу з нямецкімі акупантамі і калабарантамі. Прыблізна трэцюю частку савецкіх партызанаў складалі літоўцы. Савецкіх прыхільнікаў сярод літоўцаў было няшмат. Літоўскі народ добра разумеў, што вяртанне бальшавікоў азначае для Літвы катастрофу, менавіта страту незалежнасці, масавыя рэпрэсіі, саветызацыю культуры, гаспадарчага і грамадскага жыцця, пераслед касцёла і русіфікацыю.

Савецкае падполле актыўна пераследавалася нямецкімі службамі бяспекі і панесла буйныя страты. Да лістапада 1942 г. забіта 552 удзельнікі савецкага падполля. Разам у 1941 – 1944 г. загінула каля 1500 удзельнікаў камуністычнага руху супраціву[17].

Вялікія страты панясла таксама польскае падполле. У сярэдзіне 1943 г. на Віленшчыне ўтварыліся першыя аддзелы Арміі краёвай (АК).

[16] Eberhardt P. Przemiany narodowościowe... S. 155-156.

[17] Štaras P. Partizaninis judėjimas Lietuvoje Didžiojo Tėvynės karo metais. Vilnius, 1966. P. 233.

Актыўныя баявыя ідыверсыйныя дзеянні яны распачаліў пачатку 1944 г. З Віленшчыны паступова выцяснялася нямецкая і літоўская адміністрацыя. Часта адбываліся баі паміж літоўскай паліцыяй і АК. Падчас набліжэння савецкай арміі аддзелы віленскай і наваградскай акругаў АК ноччу з 6 на 7 ліпеня атакавалі Вільню, але самастойна заняць горад не змаглі. У баях за Вільню загінулі некалькі сотняў партызанаў АК. Усяго за час нямецкай акупацыі было арыштавана каля 6 тыс. удзельнікаў польскага падполля. У Панарах немцы расстралялі па мінімальных ацэнках 143-х жаўнераў АК[18].

У час нямецкай акупацыі было расстраляна каля 500 літоўскіх цыганоў, а каля 1000 іх дэпартавана ў канцэнтрацыйныя і працоўныя лагеры ў Германію і Францыю. На прымусовую працу ў Германію было вывезена каля 70 – 75 тыс. асобаў рознай нацыянальнасці[19].

Летам 1944 г. большасць тэрыторыі Літвы зноў была занятая савецкай арміяй. У выніку ваенных дзеянняў было знішчана каля 90% электрастанцый, каля 2\3 прамысловых прадпрыемстваў, шмат транспартных сродкаў, масты, порт у Клайпедзе. Вялікія страты панесла сельская гаспадарка (напр., колькасць хатняй жывёлы зменшылася да 47% даваеннага стану). Знішчана таксама 80 тыс. будынкаў (напр., 40% забудовы Вільні, 60% Клайпеды)[20].

Зноў пачаліся масавыя рэпрэсіі савецкіх службаў бяспекі. Ужо ў ліпені – жніўні 1944 г. Саветы інтэрнавалі 7 – 8 тыс. жаўнераў і афіцэраў АК. Ад пачатку ліпеня 1944 г. да снежня 1945 г. органы НКУС – НКДБ арыштавалі каля 12 тыс. палякаў і забілі каля 300 польскіх партызанаў[21]. Да канца 1945 г. польскае падполле ў Літве было зліквідавана.

Дэпартацыі працягваліся ад пачатку 1945 да 1953 г. Усяго ў часы сталінізму ў Літве было праведзена 35 вывазаў. Самыя буйныя дэпартацыі адбыліся ў траўні 1948 г., у сакавіку 1949 г. і ў кастрычніку 1951 г., калі ў Расею вывезлі каля 130 тыс. чалавек (80% усіх дэпартаваных)[22]. Яшчэ больш рэпрэсавана людзей за г.зв. антысавецкія злачынствы – у сталінскія часы асуджана каля 150 тыс. чалавек, якіх таксама дэпартавана ў сібірскія лагеры. З агульнай лічбы 280 тыс. вязняў і высланцаў 11,5 тыс. памерлі ў лагерах і на высланні. Гэта былі асабліва вялікія страты для народу, які ў тыя часы налічваў 2 млн. асобаў. Тэрмін высылкі быў роз-

---

[18] Pasierbska H. Ponary wileńska golgota. Sopot, 1993. S. 352-355.

[19] Rukšėnas K. Į vergovę. Vilnius, 1967. P. 102.

[20] Błaszczyk G. Litwa współczesna. S. 114.

[21] Anušauskas A. Lietuvių tautos sovietinis naikinimas 1940-1958 metais. Vilnius, 1996. P. 215.

[22] Brandišauskas V. Migracje i przemiany demograficzne na Litwie wlatach czterdziestych i pięćdziesiątych XX wieku // Europa nie prowincjonalna, pod. red. K.Jasiewicza. Warszawa, 1999. S. 1129.

ны: для вывезеных у 1941 г. – 20 гадоў, для дэпартаваных у канцы 1947 г. і ў першай палове 1948 г. сем'яў партызанаў і "памагатых бандытаў-кулакоў" – 10 гадоў. Ад 1949 г. тэрмін высылкі не акрэсліваўся, паколькі высылалі назаўсёды[23]. Пакінутая высланцамі маёмасць падлягала канфіскацыі.

Пасля вяртання Саветаў увосень 1944 г. ў Літве пачаўся партызанскі рух супраць савецкай акупацыі. У часе гэтай вайны ў збройныя шэрагі ўвайшлі каля 50 тыс. асобаў, з якіх каля 20,2 тыс. загінула ў 1944 – 1953 г. Іншыя былі арыштаваныя, пасаджаныя ў лагеры альбо расстраляныя. Партызанская вайна стала самым трагічным прыкладам барацьбы літоўскага народу за выжыванне і свабоду. Яна разбурыла міф савецкай прапаганды пра дабраахвотнае ўступленне Літвы ў СССР[24].

Другая сусветная вайна і змены межаў пасля яе завяршэння пазбавілі тысячы людзей уласнай дзяржавы. Акупацыі і тэрытарыяльныя падзелы былі галоўнымі прычынамі нацыянальных зменаў. Баючыся вяртання саветаў, з Клайпедскага краю ў 1944 г. уцякло амаль усё нямецкае насельніцтва. 1 студзеня там жыло 158,8 тыс. асобаў, а праз год у пачатку 1945 г. засталося каля 20 тыс., сярод якіх ранейшых жыхароў было толькі 2,8 тыс.[25] На нейкі час край застаўся амаль бязлюдным. Пасля вайны на іх месца прыехалі людзі з Расеі, Беларусі і іншых савецкіх рэспублік. Уцякаючы ад савецкай арміі, Літву пакінулі і выехалі ў Германію каля 60 тыс. літоўцаў[26].

У верасні 1944 г. паміж Польскай Народнай Рэспублікай і Літоўскай ССР была падпісаная дамова пра эвакуацыю былых грамадзянаў Польшчы з ЛССР у ПНР і літоўцаў з Польшчы ў Літву. Па няпоўных даных з Літвы ў Польшчу выехала 171 – 197 тыс. асобаў. Больш за 90% з іх складалі палякі. Асабліва шмат людзей страціла Вільня – у Польшчу выехала 80% яго жыхароў[27]. Колькасць палякаў у Літве скарацілася напалову. Амаль цалкам пакінула Літву польская інтэлігенцыя. Знікаў адзін з найбольш творчых асяродкаў польскай культуры[28].

Адным з парадаксальных вынікаў Другой сусветнай вайны было тое, што Літва першы раз у сваёй гісторыі атрымала ўсе найважнейшыя гарады: Вільню, Коўну і Клайпеду. Без паражэння Германіі Літва ніколі б не атрымала Клайпедскага краю, а без перамогі СССР – Віленскага краю. Пасля

[23] Grunskis E. Lietuvos gyventojų... S. 7, 9, 11.

[24] Anušauskas A. Litewska antysowiecka partyzantka i konspiracja w latach 1944-1965 // Europa nie prowincjonalna. S. 852, 853.

[25] Kairūkštytė N. Klaipėdos krašto repatriantai ir jų padėtis 1945-1950 m. // Lituanistica. 1991. Nr. 2. P. 35.

[26] Brandišauskas V. Migracje i przemiany... S. 1121.

[27] Brandišauskas V. Migracje i przemiany... S. 1123.

[28] Eberhardt P. Przemiany narodowościowe... S. 166.

атрымання незалежнасці ў 1991 г. усе еўрапейскія дзяржавы і нашыя суседзі (Польшча, Расея) прызналі існуючыя межы літоўскай дзяржавы.

У 1940 – 1953 г. Літва па розных прычынах страціла каля 1\3 сваіх жыхароў. Па дэмаграфічных стратах (прапарцыянальна да колькасці жыхароў), выкліканых Другой сусветнай вайной і акупацыямі, Літва сярод іншых еўрапейскіх краінаў не дараўноўваецца толькі да Беларусі. Даваенная колькасць жыхароў была дасягнутая толькі праз 25 гадоў пасля заканчэння вайны[29]. Літва страціла значную колькасць сваёй нешматлікай інтэлектуальнай эліты, якая была вынішчана і дэпартавана, а часткова выехала на захад. Дэмаграфічныя змены, такім чынам, мелі не толькі колькаснае, але і якаснае вымярэнне. Гэта была вельмі балючая страта, наступствы якой адчувальныя і сёння. Хоць у межах дзяржавы апынуліся Клайпедскі і Віленскі краі, тэрытарыяльныя здабыткі не маглі кампенсаваць палітычную і грамадскую катастрофу, якую прынесла Літве доўгатэрміновая савецкая анексія.

**Пераклад з польскай мовы Алеся Краўцэвіча**

## Пытанні і дыскусія пасля рэферата Арунаса Бубныса

**Алесь Краўцэвіч**: Мяне цікавіць, ці былі савецкія партызаны ў Жэмайціі? Ці існавалі літоўскія антынямецкія атрады ў перыяд нямецкай акупацыі?

**Арунас Бубныс**: Да 1943 г. савецкіх партызанаў у Жэмайціі, практычна, не было. Былі невялікія атрады савецкіх ваеннапалонных, якія збеглі з лагераў, і тых літоўцаў, якія не мелі іншага выйсця. Апошняе датычыць, напрыклад, камуністаў. Многія з іх былі забітыя ў 1941 г., многія былі кінутыя ў турмы. Але частка схавалася ў лясах. Да таго ж у гэтых атрадах былі таксама жыды, якія збеглі з гета або з лагераў. Савецкі партызанскі рух быў значна мацнейшым на Віленшчыне. Але і тут нават у канцы 1943 г. савецкія атрады былі малалікія. Апроч іх сюды закідваліся яшчэ і дыверсійныя групы, якія рабілі рэйды таксама ў заходнюю Літву і Польшчу.

Што датычыць літоўскага руху супраціўлення нямецкай акупацыі, то трэба адзначыць, што ён пачаў фармавацца ў канцы 1941 г. У той час стала вядома, што немцы не пойдуць на адраджэнне Літоўскай дзяржавы. Яны распусцілі літоўскі Часовы ўрад. Літва атрымала статус акупаванага краю і стала часткай Рэйхскамісарыяту Остланд. Першыя групы

[29] Brandišauskas V. Migracje i przemiany... S. 1130, 1131.

супраціву ствараліся на базе колішніх літоўскіх палітычных партый, напрыклад хрысціянскія дэмакраты стварылі "Літоўскі фронт", нацыяналісты – "Саюз змагароў за свабоду Літвы", а былыя афіцэры літоўскага войска – "Армію свабоды Літвы". Усе яны падчас нямецкай акупацыі прытрымліваліся тактыкі няўзброенай барацьбы, свайго роду грамадзянскага непадпарадкавання акупантам. Было разуменне, што вайна супраць немцаў абернецца вялікімі стратамі для літоўскага народу і тым самым дапаможа Саветам, якія таксама прынеслі нам шмат бяды. Было вядома, што Сталін ужо паабяцаў яшчэ раз "вызваліць" Літву. Адкрытае змаганне супраць немцаў было толькі на карысць кіраўніцтву СССР. Менавіта таму быў узяты курс на антынямецкую прапаганду, байкот мабілізацыі ў дапаможныя і паліцэйскія часткі, байкот вывазу на прымусовыя працы ў Германію. Мэтаю было захаваць жыццё літоўскага насельніцтва дзеля аднаўлення літоўскай дзяржаўнасці пасля вайны.

**Алесь Смалянчук**: Падчас палявых даследаванняў людзі часта згадваюць пра літоўскія карныя атрады. Якім быў лёс літоўцаў, якія пайшлі на службу да немцаў пасля прыходу Чырвонай арміі?

**Арунас Бубныс**: Іх лёс склаўся па-рознаму. Было зразумела, што, калі застанешся ў Літве, то будзеш асуджаны. І большасць адыходзіла разам з немцамі. Некаторыя пайшлі ў лес і далучыліся да антысавецкай партызанкі. Аднак такіх было мала, бо асноўную сілу пасляваенных партызанскіх атрадаў складала моладзь, якая байкатавала мабілізацыю і не жадала ваяваць у складзе Чырвонай арміі. Гэта быў першы і найбольш масавы кантынгент папаўнення для літоўскіх партызанаў. Многія літоўскія паліцэйскія батальёны летам 1944 г. былі пераведзеныя ў Літву або Усходнюю Прусію і там расфарміраваныя. Былыя салдаты гэтых батальёнаў былі ўключаныя або ў вермахт, або ў нямецкія паліцэйскія часткі, або ў супрацьпаветраную абарону. Эсэсаўскіх частак не было. У адрозненні ад Латвіі і Эстоніі, дзе немцы здолелі стварыць часткі СС, у Літве нічога не атрымалася. У лютым-сакавіку 1943 г. немцы паспрабавалі стварыць літоўскія эсэсаўскія часткі, аднак контрпрапаганда літоўскага падполля сарвала гэтую спробу. Легіон СС не быў створаны. А паліцэйскія батальёны ствараліся летам 1941 г. Асноўны кантынгент складалі літоўскія дзезерціры з Чырвонай арміі, або літоўцы, якія трапілі ў нямецкі палон. Апроч таго ў батальёны пайшлі людзі, якія ў 1941 г. змагаліся супраць савецкай улады і тых, хто яе падтрымліваў.

**Юры Мілеўскі**: Як у масавай свядомасці жыхароў Літвы адлюстраваўся пачатак II сятовай вайны? Калі яна пачалася для літоўцаў?

**Арунас Бубныс**: На маю думку, у масавай свядомасці літоўцаў гэтая вайна пачалася ў 1941 г., калі Германія напала на СССР.

**Юры Мілеўскі**: Як падаецца, у масавай свядомасці літоўцаў гэтая вайна не была звязаная з нейкімі асабліва жахлівымі падзеямі...

**Арунас Бубныс**: Сапраўды, у свядомасці літоўцаў больш жахліва ўспрымаецца вайна супраць Саветаў. Літоўцы змагаліся супраць Саветаў са зброяй у руках, чаго не было ў адносінах да немцаў. Нямецкую акупацыю літоўцы трактавалі як больш лагодную. Затое яны была жахлівай для жыдоўскага насельніцтва.

**Рымантас Мікныс**: Другая сусветная вайна ў памяці літоўцаў атаясамліваецца пераважна з ваеннымі падзеямі на фронце. Савецкая акупацыя разглядаецца або асобна па-за межамі вайны, або людзі сталага ўзросту гавораць, што была вайна паміж "чырвоным сатаной" і "рыжым сабакам". Што гэта значыць? У Літве не было такіх даследаванняў, якімі займаецца Алесь Смалянчук. На пачатку чэрвеня была канферэнцыя, прысвечаная памяці пра вайну. Аднак даследаванні памяці датычаць галоўным чынам адносінам людзей да помнікаў салдатам Чырвонай арміі. Ва ўсходняй Літве гэтыя помнікі засталіся на могілках савецкіх салдат і афіцэраў. З іншага боку, ёсць помнікі на могілках нямецкіх салдат. Адносіны літоўцаў да гэтых помнікаў аднолькава абыякавыя. Іх успрымаюць як чужыя. Людзі не клапоцяцца пра гэтыя помнікі. Даглядам займаюцца дзяржаўныя службы. Людзі клапоцяцца пра могілкі і помнікі літоўскіх салдат 1918 – 1919 гг. і літоўскіх партызанаў пасляваеннага часу. Гэтыя помнікі ўспрымаюцца як "свае".

**Юры Мілеўскі**: У мінулым годзе была дыскусія пра ўзнагароджанне ордэнам Гедыміна генерала Плехавічуса, які кіраваў свайго роду "літоўскім войскам". Ведаю, што дырэктар Інстытута гісторыі АН Літвы рэзка крытыкаваў гэтае ўзнагароджанне, адзначыўшы, што нельга ганарыцца тымі, хто супрацоўнічаў з нацыстамі. Наколькі гэтая пазіцыя падзяляецца ў Літве?

**Арунас Бубныс**: Гэтая ацэнка выклікала вострую крытыку з боку літоўскай грамадскасці. Я таксама лічу, што яна схематычная, бо ігнаруе розныя фактары. Вядома, што Плехавічус разам са сваім штабам быў арыштаваны эсэсаўцамі і вывезены ў канцлагер Саласпілс. Больш за 80 салдат з гэтага войска, якое існавала ад пачатку сакавіка да мая 1944 г., былі расстраляныя немцамі ў Панарах. 2/3 салдат удалося збегчы ў лес, а астатнія былі арыштаваныя немцамі і вывезеныя на прымусовыя працы ў Германію, або накіраваныя на службу ў нямецкую авіяцыю. Выказванне дырэктара Інстытуту было не зусім навукова карэктным.

**Рымантас Мікныс**: Хачу дадаць, што гісторыя з узнагароджаннем Плехавічуса прэзідэнтам мела свой палітычны падтэкст. Генерал Плехавічус быў вядомай постаццю яшчэ даваеннай літоўскай гісторыі. У дру-



гой палове 30-х гг. ён стаў адным з ініцыятараў змовы супраць прэзідэнта Грынюса. З яго дапамогай да ўлады прыйшоў Смятона і быў устаноўлены таталітарны рэжым. Плехавічус быў тым чалавекам, які знішчаў дэмакратыю ў Літве. Узнагарода Плехавічуса была ўспрынятая часткай літоўскай грамадскасці як сімвал імкнення прэзідэнта Паксаса да значнага пашырэння сваіх паўнамоцтваў і абмежавання ўлады сойму. Гэты тагачасны палітычны кантэкст істотна паўплываў на пазіцыю дырэктара Нігжэнтайціса. З погляду гістарычнай навукі, яго заўвага не была дакладнай. Пачалася дыскусія, у цэнтры якой апынулася праблема ацэнкі значэння войска Плехавічуса для Літвы. Большасць грамадскасці негатыўна адрэагавала на выказванне кіраўніка Інстытуту гісторыі. З гістарычнымі фактамі трэба абыходзіцца асцярожна. Гэта датычыць таксама і беларускай партызанкі, якую можна ацэньваць па-рознаму, але вельмі складана ацаніць адназначна.